Dipriz producing furniture
pine furniture



KITCHEN DESIGN

2018 Collections

ПРА НАС

ТАА “Дыпрыз” заснавана ў 1992 годзе ў горадзе Баранавічы. На сёння гэта буйное прадпрыемства, дзе працуе больш за 800 чалавек.

Уся прадукцыя ТАА “Дыпрыз”сертыфікаваная (сертыфікат FSC, дэкларацыя аб адпаведнасці Мытнага Саюза), а вытворчасць прайшла сацыяльны аўдыт BSCI.

Прадпрыемства мае ўласны склад плошчаю больш за 10 тыс. м2, таму амаль увесь асартымент прадукцыі заўсёды ёсць у наяўнасці, што ў сваю чаргу дазваляе хутка задавальняць замовы пакупнікоў.

Прадпрыемства заўжды інвестуе значныя сродкі ў закуп новага абсталявання, выкарыстоўвае найноўшыя дасягненні ў тэхналогіі апрацоўкі дрэва.

Асартымент мэблі ТАА “Дыпрыз” – вітальні, гасцёўні, спальні, дзіцячыя і ванныя пакоі, кухні. З 2015 года прадпрыемства распачало вытворчасць аксэсуараў.

У разнастайнасці колераў і стыляў кожны пакупнік знойдзе тое, што яму даспадобы. А цяпло натуральнага дрэва створыць камфорт і ўтульнасць у кожным доме…

Акрамя вытворчых памяшканняў, на тэрыторыі прадпрыемства размешчаны міні-заапарк з мноствам дэкаратыўных птушак і рэдкіх жывёлінаў. Таксама на абшарах каля 200 га працягваецца закладанне ландшафтнага парку, дзе плануецца пасадзіць усе рэдкія пароды дрэваў Беларусі, а тэрыторыя будзе заселена разнастайнымі звярамі ды птушкамі. Мець магчымасць бавіць час у парку змогуць не толькі супрацоўнікі прадпрыемства, але і астатнія жыхары гораду.

ЗМЕСТ

03 Пра кухню
07 Тыпы фасадаў
08 Тыпы карнізаў
08 Тыпы дабораў
09 Галерэя колераў
10 Стальніцы
10 Ручкі
11 Стандартныя опцыі
12 Дадатковыя опцыі
17 Модульны шэраг
19 Тыпавыя праекты

Стандартная опцыя

Дадатковая опцыя

ХАРАСТВО КУХНІ

Прыгожая і стылёвая кухня ў стылі мадэрн - ідэальны выбар для тых, хто аддае перавагу гармоніі простай элегантнасці і рацыянальнасці. Лаканічныя формы, стрыманыя колеры і адсутнасць напышлівасці ў дызайне - адрозніваюць рысы кухоннай мэблі, зробленай у стылі мадэрн.

ДЫЗАЙН КУХНІ

Сучасны трэнд прапануе ствараць дызайн кухні з разнастайнасцю стылістычных рашэнняў і арыгінальных ідэй, аднак усе яны сыходзяцца да аднаго - сучасная кухня павінна быць перадусім функцыянальнай і камфортнай. Хуткі тэмп нашага жыцця ўплывае на тое, што за плітою мы праводзім усё менш часу, імкнучыся гатаваць простыя і хуткія стравы. Дызайнеры ўсё часцей натхняюцца прыродай, прапаноўваючы гарманічныя рашэнні з натуральнымі адценнямі.

Водар і колер дрэва дабратворна ўплываюць на наш настрой і адорваюць радасцю. Калі Вам трэба прэстыжная кухня, масіў дрэва як асноўны матэрыял - справядлівае рашэнне!